Весці БДПУ. Серыя 2. 2018. № 2. С. 13–17

УДК 930(476):329.7"18/19"

# ПРАБЛЕМА СТАНАЎЛЕННЯ ПАРТЫЙ РЭВАЛЮЦЫЙНА-ДЭМАКРАТЫЧНАГА КІРУНКУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX ст.) У СУЧАСНАЙ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

**П. А. Трубчык,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 15.03.18.

UDC 930(476):329.7"18/19"

# THE PROBLEM OF FORMATION OF PARTIES OF REVOLUTIONARY-DEMOCRATIC DIRECTION IN THE TERRITORY OF BELARUS (THE END OF THE XIX – THE BEGINNING OF THE XX CENTURIES) IN MODERN DOMESTIC HISTORIOGRAPHY

**P. Trubchyk,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, BSPU*

Received on 15.03.18.

Аналізуюцца асноўныя дасягненні айчыннай гістарычнай навукі, прысвечаныя вывучэнню гісторыі станаўлення партый рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Артыкул утрымлівае палажэнні, якія характарызуюць аўтарскі пункт гледжання на тыя ці іншыя ацэнкі, высновы і абагульненні, прадстаўленыя ў аналізуемай літаратуры. У працы вызначаны шэраг найменш даследаваных пытанняў рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху ў Беларусі, якія патрабуюць далейшага дэталёвага вывучэння.

*Ключавыя словы:* Беларусь, гістарыяграфія, рэвалюцыйна-дэмакратычны рух, палітычныя партыі.

The main achievements of the national historical science devoted to the study of history of the formation of parties of the revolutionary-democratic direction in the territory of Belarus in the end of the XIX – the beginning of the 20th century are analyzed. The article contains propositions that characterize the author's point of view on the assessments, conclusions and generalizations presented in the analyzed literature. The range of the least researched issues of the revolutionary-democratic movement in Belarus is presented in the work. These issues require further detailed study.

*Keywords:* Belarus, historiography, revolutionary-democratic movement, political parties.

*Уводзіны.* Рэвалюцыйна-дэмакратычны лагер у Беларусі пачаў афармляцца ў пачатку 60-х гг. XIX ст., калі да кіраўніцтва вызваленчым рухам прыйшлі рэвалюцыянеры-дэмакраты, або «разначынцы» – прадстаўнікі розных сацыяльных слаёў насельніцтва. Выступаючы ад імя ўсяго беларускага народа, яны былі выразнікамі інтарэсаў працоўнага сялянства і разгарнулі шырокі народніцкі рух, накіраваны супраць царызму. Пад уплывам рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі знаходзілася плынь «чырвоных», прыняўшая актыўны ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг. З развіццём рабочага руху і распаўсюджваннем марксізму ў канцы XIX ст. арганізацыйнае афармленне рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера на тэрыторыі Беларусі значна паскорылася. У ім з'явіліся розныя палітычныя плыні: эсэраўска-народніцкая і сацыял-дэмакратычная, якія на беларускіх землях набылі нацыянальную спецыфіку ў выглядзе беларускага, польскага, яўрэйскага і іншых нацыянальных рухаў. У гэты перыяд на беларускіх землях разгарнулі сваю дзейнасць Польская партыя сацыялістычная (ППС), Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (ЛСДП), Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ), Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд), Сацыялістычная яўрэйская рабочая партыя (СЯРП), Яўрэйская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя («Паалей-Цыён»), Сіяністка-сацыялістычная працоўная партыя, Рабочы саюз Літвы (РСЛ), Латышскі сацыял-дэмакратычны саюз (ЛСДС). Былі прадстаўлены арганізацыі агульнарасійскіх палітычных партый – Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПСР) і Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП). Пазней пад іх уплывам пачалі фарміравацца палітычныя партыі беларускай нацыянальнай арыентацыі. Абапіраючыся на шырокую сацыяльную падтрымку, перш за ўсё пралетарыяту і сялянства, яны на рубяжы XIX–XX стст. сталі на шлях актыўнай барацьбы з самадзяржаўем.

*Асноўная частка.* У айчыннай гістарыяграфіі найноўшага перыяду даследаванні па

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

гісторыі палітычных партый, якія прытрымліваліся рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі ў канцы XIX – пачатку XX ст., з'явіліся з пачатку 1990-х гг. Дадзены этап у гістарычнай навуцы характарызуецца наяўнасцю новых метадалагічных падыходаў у вывучэнні палітычнай гісторыі Расіі і Беларусі дарэвалюцыйнага перыяду. З'яўляюцца працы, якія прэтэндуюць на перагляд састарэлых высноў і абагульненняў па найбольш спрэчных і даволі вострых палітычных праблемах, да якіх, безумоўна, адносіліся і пытанні рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху. Прасочваецца імкненне даць больш аб'ектыўную ацэнку грамадска-палітычным працэсам, разгляд якіх у мінулыя перыяды праводзіўся аднабакова.

З станаўленнем незалежнасці Беларусі ў пачатку 1990-х гг., ва ўмовах шматпартыйнасці, узнікла неабходнасць у падрыхтоўцы вучэбнай літаратуры па гісторыі палітычных партый. У 1993 г. выкладчыкамі Белдзяржуніверсітэта быў падрыхтаваны вучэбны дапаможнік для студэнтаў: «З гісторыі палітычных партый» пад рэдакцыяй У. К. Коршука, дзе асвятляюцца ўмовы ўзнікнення палітычных партый і рухаў на беларускіх землях. Асноўным аб'ектам даследавання выступаюць агульнарасійскія партыі, аналізуецца іх дзейнасць на тэрыторыі Беларусі, аднак фактычна не адлюстравана гісторыя нацыянальных партый (за выключэннем БСГ) [1]. У наступным, 1994 г., быў выдадзены чарговы дапаможнік «Праграмныя дакументы палітычных партый» (складальнікі: П. І. Брыгадзін, У. К. Коршук, І. Ф. Раманоўскі), дзе першы раздзел знаёміць з праграмамі беларускіх партый рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку, другі – прысвечаны агульнарасійскім палітычным партыям, якія актыўна праявілі сябе ў пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі [2].

У гэтым жа 1994 г. выйшла манаграфія П. І. Брыгадзіна «Эсеры в Белоруссии (конец XIX в. – февр. 1917 г.)», дзе беларускія землі разглядаюцца ў якасці аднаго з цэнтраў афармлення і дзейнасці партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Адзначаецца, што камітэты і групоўкі ПСР утвараліся ў асноўным у гарадах і складаліся з служачых, рамеснікаў і навучэнцаў. Па нацыянальным складзе, як падлічыў аўтар, у абсалютнай большасці гэта была яўрэйская моладзь [3, с. 148].

Гісторыя неанародніцкіх партый знаходзіць працяг у манаграфіі У. Я. Казлякова [4]. У ёй галоўная ўвага надаецца вывучэнню нацыянальнага аспекту ў праграмах і дзейнасці неанародніцкіх партый у пачатку XX ст. Акрамя гэтага, на аснове дакументальных матэрыялаў аўтар разглядае сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя ўмовы станаўлення і дзейнасці неанародніцкіх партый, а таксама асаблівасці ўзаемаадносін паміж агульнарасійскімі і нацыянальнмі партыямі гэтага кірунку на тэрыторыі Беларусі.

Нацыянальнае пытанне было важным фактарам у працэсе станаўлення палітычных партый, якія прытрымліваліся рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі. У кантэксце гістарыяграфіі беларускага нацыянальнага руху можна вылучыць працы В. А. Круталевіча [5], І. Р. Кулевіч [6], М. В. Цубы [7]. У іх у рознай ступені разглядаюцца працэсы станаўлення і развіцця беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, перадумовы ўтварэння палітычных партый на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аднак характэрнай асаблівасцю гэтых работ з'яўляецца канцэнтрацыя ўвагі даследчыкаў пераважна на гісторыі нацыянальнага руху. Змешчаны ў іх фактаграфічны матэрыял дазваляе паказаць дзейнасць беларускіх партый і арганізацый, а таксама іх лідараў. Разам з тым, у адзначаных працах не адлюстравана выніковасць гэтай дзейнасці, рэальнае месца беларускага руху сярод іншых партый і рухаў рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера і яго ўплыў на палітычныя падзеі.

У сучаснай гістарыяграфіі даволі часта ўздымаецца пытанне аб прычынах больш позняга станаўлення беларускіх нацыянальных партый у параўнанні з нацыянальнымі палітычнымі арганізацыямі іншых народаў на тэрыторыі Беларусі, што, у сваю чаргу, сведчыла аб адставанні нацыятворчага працэсу беларускай нацыі. Шэраг даследчыкаў лічаць, што нацыянальна-культурнае развіццё беларусаў стрымлівалася ўмовамі руска-польскага супрацьстаяння на беларускіх землях, наяўнасцю канфесіянальнага падзелу сярод беларускага этнасу на праваслаўных і католікаў, а таксама спецыфічнымі ўмовамі сацыяльна-эканамічнага развіцця Паўночна-Заходняга краю, што прадвызначылі фактычную адсутнасць беларускай нацыянальнай буржуазіі, якая б магла выступіць з патрабаваннем як эканамічнай, так і палітычнай самастойнасці для свайго краю [8, с. 4–10; 9; 10].

Аднак ёсць і іншыя падыходы. Так, па меркаванні С. Токця, на першае месца неабходна паставіць моўна-этнічную блізкасць да суседніх славянскіх народаў, што ў многім спрыяла асіміляцыі беларускага насельніцтва [11, с. 75]. З гэтым нельга пагадзіцца ў поўнай меры, паколькі падобныя ўмовы былі характэрны і для іншых этнасаў, якія пражывалі на тэрыторыі заходніх губерняў. Па сцвярджэнні С. Рудовіча, сур'ёзнай перашкодай на шляху кансалідацыі беларускага этнасу было размеркаванне беларускай тэрыторыі ў складзе Расійскай імперыі паміж некалькімі губернямі,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

межы якіх не адпавядалі этнічным межам [12, с. 28]. На думку даследчыка, такое становішча размывала культурна-гістарычную самабытнасць краю, стрымлівала выяўленне мясцовай ініцыятывы.

Нягледзячы на некалькі замаруджаныя тэмпы фарміравання беларускай нацыі, пэўныя працэсы ўсё ж такі адбываліся. На пачатку XX ст. пачынаецца афармленне партый беларускай нацыянальнай арыентацыі. У беларускай гістарыяграфіі пытанне аб утварэнні БСГ застаецца спрэчным. У 1997 г. А. Г. Тогулева абараніла кандыдацкую дысертацыю – «Беларуская сацыялістычная грамада: праблемы ўтварэння і палітычнай дзейнасці» [13]. Аўтар прыйшла да высновы, што ў 1902 г. Беларуская рэвалюцыйная партыя, якая нарадзілася з беларускіх студэнцкіх гурткоў, залажыла асновы для стварэння ў 1903 г. Беларускай рэвалюцыйнай грамады, якая ў хуткім часе стала Беларускай сацыялістычнай грамадой. Тым не менш, аўтары некаторых публікацый надаюць вялікую ролю ў гэтым працэсе ўкраінскаму нацыянальнаму руху [11, с. 74]. Яшчэ больш даследчыкаў лічаць, што ўтварэнне БСГ адбывалася пад уплывам польскіх сацыялістаў [14, с. 14–15; 15, с. 6–7; 16]. Аналізуючы прыведзеныя пазіцыі, нельга не пагадзіцца з тым, што маштабы беларускага нацыянальнага руху былі слабейшымі ў параўнанні з украінскім, літоўскім або польскім рухам. У тым жа дысертацыйным даследаванні А. Г. Тогулевай адзначаецца, што БСГ у першым перыядзе яе працы да рэвалюцыі 1905 г. была тыповым вузкім рэвалюцыйным гуртком, які не меў цесных сувязей ні з рабочым класам, ні з сялянствам Беларусі [13, с. 17]. Разам з тым, неабходна адзначыць, што дзейнасць украінскіх нацыянальных арганізацый фактычна не адчувалася на беларускіх землях. Таму аказаць вялікага ўплыву на афармленне партый і арганізацый беларускай арыентацыі яны не маглі. У той жа час нельга ігнараваць той факт, што ўключэнне ў праграму БСГ патрабавання нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння беларусаў адбылося хутчэй за ўсё не без уплыву Польскай партыі сацыялістычнай і Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі, якія значна раней вызначылі ў якасці сваіх галоўных першачарговых задач барацьбу за незалежнасць сваіх народаў. Пры гэтым неабходна адзначыць, што гэта не мела выключнага значэння ў працэсе афармлення беларускай нацыянальнай партыі. БСГ істотна адрознівалася ад названых арганізацый тым, што ў барацьбе за рэалізацыю сваёй праграмы арыентавалася на саюз з расійскім вызваленчым рухам, ад якога ППС і ЛСДП ізаляваліся. Пры даследаванні гэтага пытання таксама неабходна ўлічваць імкненне правых сіл у польскім сацыялістычным руху выкарыстаць у сваіх мэтах абуджэнне нацыянальнай свядомасці сярод беларусаў, украінцаў і літоўцаў. Даследчык беларуска-расійска-польскіх узаемасувязей і пытанняў міжканфесійных адносін В. М. Чарапіца ў манаграфіі «Истоки: очерки из истории русско-белорусско-польских революционных и культурных связей XIX – начала XX веков» прыводзіць выказванні па гэтай праблеме вядомага польскага сацыяліста С. Мельдэнсона, які яшчэ ў 1891 г. на старонках польскага друку пісаў аб тым, што ў адкрытай узброенай барацьбе з самаўладдзем павінны быць выкарыстаны ўсе палітычныя фактары, у тым ліку і такі, як «шлях поўнага збліжэння з літоўцамі, беларусамі, а часткова нават і з украінцамі» [17, с. 92].

Пытаннем узаемаадносін беларускага нацыянальнага руху з польскімі сацыялістамі займаўся І. Янкевіч [16, с. 18–22]. Даследчык адзначае, што ППС, супрацоўнічаючы з БСГ, імкнулася пашырыць свой уплыў на беларускае насельніцтва і падпарадкаваць беларускі нацыянальны рух, аднак дасягнуць гэтай мэты не змагла. Да такой высновы аўтар прыходзіць на падставе аналізу ўзнікнення ў 1904 г. па ініцыятыве ППС Сацыялістычнай партыі Белай Русі (СПБР), якая мела такую ж праграму, як і БСГ, з розніцай у тым, што выказвалася за федэрацыю не з Расіяй, а з Польшчай. Тое, што партыя была ўтворана штучна і не мела ўплыву на беларускае насельніцтва, пацвярджаецца яе распадам з прычыны непапулярнасці напрыканцы рэвалюцыі 1905–1907 гг.

Р. Літвінёнак, аналізуючы дзейнасць польскіх партый і груповак на беларускіх землях, прыйшла да высновы, што ў іх асяроддзі стаўленне да беларускага нацыянальнага руху хісталася ад крайне негатыўных пазіцый нацыянал-дэмакратаў да абыякавых краёўцаў-кансерватараў [18].

У кантэксце разглядаемай праблемы заслугоўвае ўвагі даследаванне А. Ф. Смалянчука, якое тычылася афармлення і дзейнасці польскага грамадска-палітычнага руху на беларускіх землях. Ім упершыню ў навуковы зварот уводзіцца тэрмін «польскі нацыянальны рух», пад якім разумеецца «гаспадарчая, культурна-рэлігійная грамадская і палітычная дзейнасць, накіраваная на захаванне і ўмацаванне пазіцый польскай грамадскасці на беларускіх і літоўскіх землях». На думку даследчыка, сацыяльна-эканамічная база, створаная польскім насельніцтвам краю, стала падмуркам для фарміравання перадумоў дзейнасці тут польскіх палітычных партый [19].

Дзейнасць польскіх палітычных партый на беларускіх землях разглядаецца і ў працах

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

І. І. Коўкеля. Пачатак распаўсюджання марксізму ў Беларусі і зараджэнне мясцовага сацыял-дэмакратычнага руху аўтар звязвае з першай польскай рабочай партыяй «Пралетарыят», якая ўзнікла яшчэ ў верасні 1882 г. Гэта тлумачыцца найперш тым, што ў шэрагах «Пралетарыяту» дзейнічала нямала ўраджэнцаў Беларусі, а яе аддзелы былі ў Пінску, Вілейцы, Мінску, Брэсце, Гродне і Віцебску [20, с. 17]. У цэлым жа, на думку даследчыка, заяўленая праблема не знайшла належнага адлюстравання ў беларускай гістарыяграфіі. Хаця ў свой час уклад у яе распрацоўку ўнеслі беларускія гісторыкі У. І. Салашэнка («Распространение марксизма и образование социал-демократических организаций Белоруссии (1883–1904 гг.)») і М. В. Біч («Развитие социал-демократического движения в Белоруссии в 1883–1903 гг.») [21; 22].

Станаўленне палітычных партый на беларускіх землях у канцы XIX – пачатку XX ст., якія прытрымліваліся рэвалюцыйна-дэмакратычнай ідэалогіі, ахарактарызаваў М. С. Сташкевіч. Ён адзначаў, што, з аднаго боку, гэта было вынікам пэўнага ўзроўню дэмакратычнага развіцця грамадства, з другога – палітыкі самадзяржаўя. Паглыбленне сацыяльных супярэчнасцей, непрыняцце шырокімі слаямі насельніцтва існуючага палітычнага рэжыму прывялі да таго, што «пралетарыят і іншыя пласты працоўнага насельніцтва Расіі, ад імя якіх выступала радыкальна настроеная марксісцкая і народніцкая інтэлігенцыя, абагналі ў сваім палітычным развіцці буржуазію і памешчыкаў», паклаўшы пачатак стварэнню як агульнарасійскіх, так і нацыянальных партый сацыялістычнай арыентацыі [23, с. 21].

*Заключэнне.* Такім чынам, праведзены гістарыяграфічны агляд дэмакратычнага руху сведчыць аб наяўнасці розных поглядаў і ацэнак на праблему станаўлення палітычных партый і рухаў сацыялістычнага кірунку на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. З аднаго боку, зараджэнне масавага рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху і ўзнікненне першых палітычных партый, якія выражалі інтарэсы рабочых, сялян і іншых дэмакратычных слаёў насельніцтва, былі звязаны з развіццём капіталістычных адносін у грамадстве, змяненнем яго сацыяльнай структуры, узнікненнем новых класаў, спецыфікай сацыяльна-эканамічнага развіцця. З другога – гэта вызначалася крызісам сістэмы нацыянальна-дзяржаўных адносін і асаблівым палітычным курсам, які праводзіўся на гэтых землях расійскім самаўладдзем, шматнацыянальным складам насельніцтва, новым узроўнем самасвядомасці насельніцтва, пачаткам палітычнай барацьбы за нацыянальнае самавызначэнне. Разам з тым, нягледзячы на даволі шырокі пласт навуковай літаратуры, праблема станаўлення палітычных партый рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. асветлена недастаткова. Гэта тычыцца найперш нацыянальных партый (яўрэйскіх, літоўскіх, украінскіх) і іх узаемаадносін у барацьбе за нацыянальнае самавызначэнне. Фактычна не разглядаецца пытанне аб уплыве палітычных партый на распрацоўку і ажыццяўленне дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў Паўночна-Заходнім краі.


Літаратура

1. З гісторыі палітычных партый : вучэб. дапам. для студ. / У. К. Коршук [і інш.] ; пад рэд. У. К. Коршука. – Мінск : Белдзяржуніверсітэт, 1993. – 110 с.
2. Праграмныя дакументы палітычных партый : вучэб. дапам. для студ. / П. І. Брыгадзін, У. К. Коршук, І. Ф. Раманоўскі ; адказ. рэд. У. К. Коршук. – Мінск : Белдзяржуніверсітэт, 1994. – 100 с.
3. *Бригадин, П. И.* Эсеры в Белоруссии (конец XIX в. – февр. 1917 г.) / П. И. Бригадин. – Минск : Згода, 1994. – 152 с.
4. *Козляков, В. Е.* Национальный вопрос и неонароднические партии. Начало XX в. – конец 20-х гг. (на материалах России, Беларуси, Украины) / В. Е. Козляков. – Минск : БГТУ, 2001. – 246 с.
5. *Круталевич, В. А.* На путях национального самоопределения (БНР – БССР – РБ). Серия: Общественно-политические науки / В. А. Круталевич. – Минск : Право и Экономика, 1995. – 138 с.
6. *Кулевіч, І. Р.* Беларускі нацыянальны рух (1902–1925): гістарыяграфія праблемы / І. Р. Кулевіч ; нав. рэд. І. І. Коўкель. – Гродна : ГрДУ, 2007. – 139 с.
7. *Цуба, М. В.* Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907 – люты 1917 гг.) / М. В. Цуба. – Брэст : Выд-ва С. Лаўрова, 2003. – 196 с.

References

1. Z gistoryi palitychnykh party : vucheb. dapam. dlya stud. / U. K. Korshuk [i insh.] ; pad red. U. K. Korshuka. – Minsk : Beldzyarzhuniversitet, 1993. – 110 s.
2. Pragramnyya dakumenty palitychnykh party : vucheb. dapam. dlya stud. / P. I. Brygadzin, U. K. Korshuk, I. F. Ramanouski ; adkaz. red. U. K. Korshul. – Minsk : Beldzyarzhuniversitet, 1994. – 100 s.
3. *Brigadin, P. I.* Esery v Belorussii (konets XIX v. – fevr. 1917 g.) / P. I. Brigadin. – Minsk : Zgoda, 1994. – 152 s.
4. *Kozlyakov, V. Ye.* Natsionalnyy vopros i neonarodnicheskiye partii. Nachalo XX v. – konets 20-kh gg. (na materialakh Rossii, Belarusi, Ukrainy) / V. Ye. Kozlyakov. – Minsk : BGTU, 2001. – 246 s.
5. *Krutalevich, V. A.* Na putyakh natsionalnogo samoopredeleniya (BNR – BSSR – RB). Seriya: Obshchestvenno-politicheskiye nauki / V. A. Krutalevich. – Minsk : Pravo i Ekonomika, 1995. – 138 s.
6. *Kulevich, I. R.* Belaruski natsyyanalny rukh (1902-1925): gistaryyagrafiya prablemy / I. R. Kulevich ; nav. red. I. I. Koukel. – Grodna : GrDU, 2007. – 139 s.
7. *Tsuba, M. V.* Belaruski natsyyanalny rukh u peryyad pamizh dzvyuma demakratychnymi revalyutsyyami (1907 – lyuty 1917 gg.) / M. V. Tsuba. – Brest : Vyd-va S. Laurova, 2003. – 196 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

